Жыве Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№239 (752) 8 снежня 1993 г. Серада. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 500023 экз. Кошт у розніцу — 25 руб.

Знай наших!

На заседании Совета европейского филиала Международного совета по проблемам малого бизнеса (ECSB), прошедшего в Будапеште, принято решение о выдвижении кандидатуры на пост вице-президента ECSB от Республики Беларусь.

Как сообщил в официальном письме президент ECSB профессор Дж.Вианен, на пост вице-президента этой влиятельной международной организации рекомендован президент Союза предпринимателей Республики Беларусь В.Н.Карягин. Вопрос будет поставлен на голосование перед членами Совета ECSB на ближайшем его заседании.

Роман ШЕВКО.

Откуда дровишки?

Оригинальный способ расчистки бурелома придумали в Лиозненском районе.

Здешние лесоводы разрешили всем желающим разбирать поваленные ураганными ветрами нынешнего года деревья на дрова, причем практически бесплатно, по сотне-другой за кубометр. Охотники при дефиците топлива находятся. Если бы еще и горючее для бензопил и автомашин было бы так же дешево...

Сергей ДВИНСКИЙ.

Бригада печатает шаг

В Бресте состоялось торжественное вручение боевого знамени последней сформированной бригаде Вооруженных Сил Республики Беларусь.

Этим событием завершилось переформирование белорусской армии по новому, бригадному принципу. До этого она подразделялась на дивизии.

Вячеслав БУДКЕВИЧ.

Стеклянная "бомба" под ПО "Полимир"?

"Бомбу" под новополоцкое ПО "Полимир" — крупнейшего производителя полиэтилена — исподволь закладывает близкий сосед — полоцкое ПО "Стекловолокно".

Здесь близится к концу разработка прозрачной стеклоткани для парников, которая, в отличие от популярной полиэтиленовой пленки, может служить без замены до 10 лет.

Сергей ВИТЕБСКИЙ.

Виртуозы собираются в Витебске

Все более солидным по программе становится с каждым годом Витебский музыкальный фестиваль имени Ивана Соллертинского.

Нынешний, 5-й, который открывается завтра, собрал замечательных исполнителей: минский ансамбль солистов "Классик-авангард", Московский музыкальный театр "Геликон", пианиста из Швейцарии Эмму Хенц-Димонд и других. В афише фестиваля — произведения многих композиторов, чье творчество ценил, изучал и страстно пропагандировал уроженец Витебска, выдающийся музыкальный деятель И.И.Соллертинский.

Сергей БУТКЕВИЧ.

ФАКС

Вкратце

В Кишиневе министрами транспорта Беларуси и Молдовы подписаны межправительственное соглашение и протокол о сотрудничестве между двумя странами в сфере железнодорожного сообщения.

Речь идет о восстановлении тесных и взаимовыгодных связей, организаций взаиморасчетов по международным перевозкам без посредничества Москвы.

❑

8—9 декабря ожидается приезд в Минск американской части Российско-американской объединенной комиссии по вопросам розыска и возвращения американских военнослужащих, пропавших без вести в ходе второй мировой войны и вооруженных конфликтов.

В составе делегации — сенатор и два конгрессмена США, высокопоставленные чиновники из госдепартамента и Министерства обороны.

❑

12 шахт объединения "Воркутауголь" продолжают начатую 6 декабря бессрочную забастовку, несмотря на подписанный поздно вечером в понедельник в Москве протокол об удовлетворении требований Независимого профсоюза горняков России к правительству.

Горняки заявляют, что достигнутые в Москве договоренности "не решают проблем северян, которым с сентября месяца задерживается зарплата".

❑

Экс-президент Азербайджана Аяз Муталибов намерен вернуться к активной политической деятельности.

А.Муталибов, избранный президентом на всеобщих выборах в сентябре 1990 года, был вынужден уйти в отставку под давлением оппозиционного Народного фронта в марте 1992 года.

❑

Абхазские формирования вчера утром открыли интенсивный артиллерийский огонь по грузинским позициям в районе села Лата.

По предварительным данным, среди мирного грузинского населения четыре человека убиты, более десяти ранены.

❑

Милли-меджлис (парламент) Азербайджана временно приостановил действие статьи Закона о средствах массовой информации, которая запрещала введение цензуры.

Это сделано с целью предотвратить появление в печати информации, содержащей военную тайну или государственные секреты.

❑

Пресс-служба Либерально-демократической партии России (ЛДПР) распространила вчера сообщение о том, что "на кандидата в депутаты Государственной Думы, председателя ЛДПР Владимира Жириновского совершено нападение".

Согласно сообщению, это произошло накануне вечером в театре Эстрады. Нападавший задержан и доставлен в милицию.

❑

На процессе по делу ГКЧП вчера объявлен перерыв.

Процесс, по решению суда, возобновится после выздоровления В.Павлова и А.Лукьянова.

❑

14 подследственных совершили побег из изолятора временного содержания в Калининграде.

По данным областного управления МВД, шестеро участников побега уже задержаны, в отношении остальных ведутся активные розыскные мероприятия.



Рисунок Олега ПОПОВА.

Спорт-экспресс

Два матча Кубка европейских чемпионок по волейболу провела минская команда "Амкодор" в Финляндии. Сначала она проиграла команде "Ваасам" со счетом 2:3, а потом выиграла ответную встречу — 3:0. "Амкодор" — в следующем круге розыгрыша.

❑

У мужчин в розыгрыше волейбольного Кубка кубков брестский "Западный Буг" проиграл венгерской команде "Папирон" в Сегеде со счетом 0:3. Ответный матч состоится в Бресте.

❑

В минском Дворце спорта в очередном матче чемпионата МХЛ "Тивали" принимала московские "Крылья Советов". Минские хоккеисты проиграли со счетом 1:3 (0:0, 1:2, 0:1). Теперь 9 декабря "Тивали" сыграет в Санкт-Петербурге с СКА, а 12-го примет на крытом катке в парке Горького московское "Динамо". Это будет генеральная репетиция перед розыгрышем приза "Известий" в Москве и финалом Кубка Европы в Дюссельдорфе.

Банановая Москва

В декабре каждый москвич сможет получить 1 бесплатный банан.

Их будут раздавать в детских садах, больницах, школах и даже прямо на улицах.

Акция проводится по инициативе президента одной немецкой фирмы. К Новому году он решил подарить москвичам 100 тысяч ящиков экзотических фруктов. По подсчетам немецкого коммерсанта, это составит 10 миллионов штук, то есть по банану на каждого жителя Москвы.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, Интерфакс, БелаПАН.

На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

"Давайте полоть, а не косить поголовно!" —

так сфармуляваў свой падыход да абмеркавання закона "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання" народны дэпутат Іван Смоляр

Сяргей ПЛЫТКЕВІЧ

Зразумела, што ў іншых дэпутатаў быў свой погляд на гэты закон, таму дыскусія па ім учора пачалася вельмі бурная і доўгі час здавалася, што будзе безвыніковай. Чаму? Таму што прапанова старшынствуючага на сесіі першага намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета Вячаслава Кузняцова прыняць гэты закон за аснову, а потым прыступіць да дэталёвага абмеркавання кожнай змены, набрала спачатку толькі сто шэсцьдзесят восем галасоў. Раман Іосіфавіч Унучка, які прадстаўляў законапраект, адрэагаваў на выніку галасавання своеасабліва: ён пакінуў трыбуну, сказаўшы перад гэтым зале:

— Дзякуй вам. Я адчуваю: стабілізацыя эканамічнага становішча ў нас адбудзецца абавязкова!

Ці то яго словы падзейнічалі, ці то астатнія дэпутаты самі зразумелі, што, магчыма, прынялі не самае лепшае рашэнне, наогул адхіліўшы законапраект, але пасля многіх заклікаў перагаласаваць альбо пачаць разглядаць папраўкі да кожнага закона паасобку, парламент ста васьмюдзесяццю шасцю галасамі прымае рашэнне прыняць праект закона за аснову. Былі, праўда, заклікі дэпутатаў ад апазіцыі Уладзіміра Новіка, Уладзіміра Заблоцкага разабрацца спачатку з расходамі, разгледзець рэспубліканскі бюджэт, а потым ужо вырашаць, якім чынам яго напаўняць.

— Мяне здзіўляе, — гаварыў Уладзімір Новік, — пазіцыя нашага ўрада і камісіі Унучкі, якія пастаянна супраціўляюцца ўзмацненню нашага рубля. У дадзенай сітуацыі разглядаць падаткі няма сэнсу да разгляду пытання аб узмацненні фінансавай сістэмы. Кожны год мы фактычна змяняем сваю падатковую сістэму, бо кожны раз мы прымаем цэлы пакет папраўак. Зараз наша фінансавая сістэма фактычна перажывае параліч. І гэта — вынік дзейнасці нашай Планава-бюджэтнай камісіі і ўрада.

Аб тым, што толькі стабільная падатковая сістэма можа па-сапраўднаму стымуляваць вытворчасць, гаварыў і народны дэпутат Аляксандр Сасноў.

Нельга не засяродзіць увагу чытачоў і на прамовах яшчэ трох дэпутатаў — Уладзіміра Станкевіча, Уладзіміра Гаркуна і Лявонція Зданевіча.

Уладзімір Станкевіч, падкрэсліўшы, што ён не лабіст, што, калі закранаюцца фінансавыя пытанні, ён стараецца не падыходзіць да мікрафона, бо абмяркоўваць гэтыя пытанні павінны спецыялісты, а не дылетанты, прапанаваў не браць падаткаў з бюджэтных арганізацый, у першую чаргу з работнікаў міліцыі і ваеннаслужачых.

Уладзімір Гаркун прапанаваў, наколькі магчыма, паменшыць падаткі з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, а Лявонцій Зданевіч выказаў яшчэ больш радыкальную прапанову: наогул вызваліць сельскую гаспадарку ад усіх падаткаў! І тады, закончыў сваю думку народны дэпутат, мы, можа, нарэшце зразумеем, што справа не ў падатках, што даўно наспеў час сельскую гаспадарку рэфармаваць.

Былі іншыя прапановы і заўвагі, але, як я ўжо адзначаў, большасцю галасоў Вярхоўны Савет прыняў праект закона "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання" за аснову і пачаў абмяркоўваць усе канкрэтныя папраўкі. А іх нямала, бо для таго, каб зрабіць новую сістэму падаткаабкладання цэльнай, распрацоўшчыкі законапраекта палічылі неабходным зрабіць тыя ці іншыя змены ажно ў 23 заканадаўчых актах, якія Вярхоўны Савет прыняў раней.

У другой палове дня Вярхоўны Савет працягваў разгляд папраўак у закон аб падатках.

Постановление Совета Министров Республики Беларусь

О повышении заработной платы педагогическим работникам, профессорско-преподавательскому составу, а также отдельным категориям работников здравоохранения, социального обеспечения, науки, физкультуры и спорта, культуры и искусства.

Совет Министров Республики Беларусь **постановляет**:

1. Повысить с 1 декабря 1993 г. заработную плату педагогическим работникам, в том числе профессорско-преподавательскому составу, а также отдельным категориям работников здравоохранения, социального обеспечения, науки, физкультуры и спорта, культуры и искусства путем повышения их тарификации на один-два разряда.

Поручить Государственному комитету Республики Беларусь по труду и социальной защите населения по согласованию с Министерством финансов внести изменения в постановление Государственного комитета Республики Беларусь по труду и социальной защите населения от 21 января 1992 г. №6.

2. Осуществить в декабре 1993 г. компенсационные выплаты студентам высших учебных заведений, учащимся средних специальных учебных заведений и профессионально-технических училищ со сроком обучения до 10 месяцев в размере 5000 рублей за счет средств республиканского бюджета.

3. Установить с 1 января 1994 г. работникам, имеющим ученую степень доктора наук, основным местом работы которых являются организации науки, образования и здравоохранения, финансируемые за счет средств государственного бюджета, ежемесячные доплаты в размере трех минимальных заработных плат, независимо от занимаемой должности. Указанные доплаты производить по основному месту работы.

4. Министерству финансов внести предложения о порядке предоставления в 1994 году налоговых льгот учреждениям и организациям образования, здравоохранения и других отраслей бюджетной сферы.

Председатель Совета Министров Республики Беларусь В.КЕБИЧ.

Управляющий делами Совета Министров Республики Беларусь Н.КАВКО.

7 декабря 1993 г. № 826. г.Минск.

Украіна — Беларусь

Давайце жыць дружна

Устаноўчая канферэнцыя таварыства дружбы "Украіна—Беларусь" адбылася ў Кіеве.

Прызначэнне таварыства — садзейнічаць далейшаму развіццю эканамічных, навукова-тэхнічных, культурных і іншых сувязей абедзвюх краін, устанаўленне кантактаў паміж калектывамі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь на Украіне Віталь Кураш, а таксама прадстаўнікі беларускіх культурна-асветніцкіх таварыстваў, дзеячы культуры і мастацтва, кіраўнікі творчых саюзаў і арганізацый суседняй дзяржавы.

Прэзідэнтам таварыства выбраны акадэмік Акадэміі навук Украіны Ігар Пагодня.

Белінфарм.

Из первых уст

Если бы не СНГ...

Специально для "Народной газеты" с Исполнительным секретарем Содружества Независимых Государств Иваном Коротченей беседуют корреспонденты "Интерфакса" Вячеслав Зенькович и Александр Владимиров

— Иван Михайлович, Содружеству Независимых Государств исполнилось два года. Что, на Ваш взгляд, дал этот срок вошедшим в него государствам?

— Прежде всего то, что никто не стал "резать по-живому" и насильно, через кровь, ломая человеческие судьбы, разъединять народы созданием неприступных границ. Наоборот, создание Содружества Независимых Государств позволило его субъектам безболезненно или почти безболезненно встать на путь проведения демократических преобразований в качестве новых суверенных государств. В результате отношения между странами — участниками СНГ характеризуются как дружественные, добрососедские, основанные на взаимовыгодном сотрудничестве и взаимопомощи.

Кроме того, Содружество обеспечивает сохранение не только взаимодействия республик, в определенной степени препятствует разрушению хозяйственных связей, но и, что, на мой взгляд, очень важно, позволяет людям легче переносить дискомфортные моменты личного плана, связанные с переходом стран Содружества к рыночным отношениям. Во всяком случае, большинство людей благодаря существованию СНГ сохраняют ощущение, что мы живем в едином пространстве и именно с СНГ связывают надежды на скорейшее преодоление кризисных явлений.

Прошедший год был знаменателен подписанием Договора об Экономическом союзе, что, как мне представляется, явилось качественно новым этапом в жизни Содружества: в его рамках стали приниматься конкретные меры по укреплению создаваемых на основе рыночных отношений хозяйственных связей. Подписание в начале 1993 года Устава Содружества — важнейшего документа, формирующего правовую базу СНГ, стало подтверждением стремления стран Содружества укреплять СНГ. Не перечисляя других важных событий года, конечно же, нельзя не упомянуть и о вступлении в Содружество новых членов — Азербайджана и Грузии.

Категорически осуждаю всякие разглагольствования на тему: нужно ли СНГ? Убежден: оно необходимо хотя бы потому, чтобы в свое время создать условия для цивилизованного, ненасильного "развода" бывших субъектов СССР. Страшно представить, что этот "развод" состоялся бы стихийно, не считаясь с нормами международного права, игнорируя жизненные реалии, без учета деятельности единого народнохозяйственного комплекса, сформировавшегося в течение нескольких десятилетий. Поверьте, говорю это не как международный чиновник, карьера которого зависит от дальнейшей судьбы СНГ. По крайней мере, я ушел работать в координирующие органы Содружества с достаточно высокого поста — члена Президиума Верховного Совета Беларуси, главы парламентской Комиссии по вопросам гласности, средств массовой информации и прав человека. Утверждаю как человек, искренне убежденный в том, что нельзя недооценивать роль СНГ в жизни народов бывшего СССР.

— Какие выводы можно сделать за два года существования СНГ, что положительного оно принесло?

— Главный итог: СНГ — реальность. Вопреки всем пессимистическим прогнозам, она продолжает развиваться и укрепляться. Даже если вспомнить известное мнение, что "СНГ — это механизм цивилизованного развода", — то этот процесс действительно происходит мирно, путем переговоров. А учитывая, что республики делят, например, собственность бывшего СССР, включая имущество Советской армии и флота, ядерное оружие, то недооценивать роль СНГ здесь просто нельзя.

Напомню, именно благодаря усилиям Содружества Независимых Государств в 1993 году удалось погасить кровавые конфликты в Приднестровье и в Таджикистане.

— Многое из того, что было декларировано в пакете беловежских соглашений, а затем подтверждено Алма-Атинской декларацией, на практике не выполняется...

— Действительно, сегодня можно констатировать, что единое экономическое пространство, единая валюта, объединенные вооруженные силы, общие пограничные войска просуществовали недолго. Однако означает ли это, что Содружество не смогло реализовать предначертанных ему функций? С позиций сегодняшнего дня такая постановка вопроса, по сути дела, сводится к вопросу — могло ли СНГ остановить процесс приобретения его членами государственного суверенитета и наполнения его конкретным содержанием?

Ответ может быть только один — нет, не могло, поскольку не только не имело для этого полномочий, но и не ставило перед собой такой цели. Это противоречие между провозглашенными принципами и реальным процессом создания членами СНГ собственных армий, введения национальных валют и других непременных атрибутов суверенитета явилось основным признаком всей жизни СНГ в течение этих двух лет. И в том, что, опять благодаря существованию Содружества, процесс становления государственности молодых стран продолжается, причем продолжается эволюционным путем, без насилия, без революций и других потрясений, видится огромное преимущество, большая положительная роль СНГ.

Заложенные в основополагающих документах СНГ принципы не обречены на забвение. Они будут реализованы, однако в свое время. Видимо, процесс интеграции на новых условиях может начаться после того, как произойдет окончательное утверждение членов СНГ как политически и экономически независимых государств.

Можно предположить, что нынешний год существования СНГ был критическим в плане разъединения и дезинтеграции субъектов Содружества. Подтверждение этому — подписание Договора о создании Экономического союза.

Обвальный разрыв прежних хозяйственных связей, структурная перестройка и переход на рыночные отношения, формирование собственных экономических структур подтолкнули государства СНГ к поиску новых форм связей и взаимодействия. В результате появилась идея Экономического союза, важным стимулом создания которого стало также понимание того, что выход на западный рынок и возможность инвестиций из-за рубежа не следует переоценивать, а хаос в экономике может вызвать серьезные социальные потрясения.

— Вместе с тем результаты подписания Устава СНГ и Договора об Экономическом союзе, а также ход формирования таких органов, как Экономический суд и Межгосударственный банк СНГ, свидетельствуют о различных уровнях желания и готовности к сотрудничеству среди государств — членов СНГ.

— В последнее время этот очевидный факт часто трактуется как некий тревожный симптом состояния дел в Содружестве. Представляется, что подобные утверждения не совсем правильны. Нельзя забывать, что СНГ — это не государство и не надгосударственное образование. Это уникальное явление! Речь идет о взаимоотношениях государств, пусть и тесно связанных между собой, но все же имеющих конкретный, зачастую отличный от других интерес в той или иной сфере межгосударственных отношений. Свежий пример тому — известные разногласия между Россией и некоторыми другими государствами по вопросу о рублевой зоне. Было бы удивительно, если бы во взаимоотношениях государств СНГ на многосторонней основе все было гладко, без споров, без мучительного поиска компромиссов, нужных подходов и условий...

— Считалось, что подпись главы государства или правительства под документом сама по себе является гарантией его выполнения, даже если соглашение не предусматривает процедуру ратификации. Кажется, это не совсем так?

— Проблема реализации многосторонних соглашений явилась одним из важных мотивов, приведших к созданию Координационно-консультативного комитета СНГ, который должен был стать органом, обладающим реальными правами и возможностями, органом, способным организовать реализацию принимаемых в рамках СНГ документов, контролировать этот процесс, заниматься практическими повседневными вопросами сотрудничества, прежде всего в экономической сфере.

Комитет задумывался как орган, состоящий из действующих заместителей глав правительств с тем, чтобы его члены, обладающие конкретными правами и полномочиями в своих государствах, могли принимать окончательные решения по вопросам, входящим в их компетенцию, разгрузив, соответственно, Совет глав правительств для работы над основополагающими проблемами СНГ.

Однако пока Координационно-консультативный комитет не стал таким органом. К сожалению, его функции сводятся пока к окончательной шлифовке проектов документов, что, впрочем, также немаловажно.

— Хотелось бы услышать Ваше мнение о взаимоотношениях между главами государств. Бытует мнение, что встречи в верхах проходят в сугубо официальной обстановке.

— Встречи в верхах являются в том числе и местом для личных бесед, разговоров по проблемам, выходящим за рамки повестки дня. Это позволяет не только быстро находить нужные решения, но, по моим наблюдениям, именно в ходе таких бесед главы государств и правительств сверяют свои идеи и задумки, готовят будущие шаги по укреплению Содружества.

Хотел бы также отметить атмосферу дружественности, взаимоуважения, отсутствия даже малейшего намека на неприязнь среди руководителей государств — членов СНГ. Их желание найти приемлемые решения отстоять интересы своей страны всегда сопровождается внимательным отношением к противоположной точке зрения.

И еще об одном качестве, характеризующем, на мой взгляд, атмосферу заседаний глав государств. Как известно, Молдова, Туркмения и Украина пока не подписали Устав СНГ. Это право руководителей, принимавших решение, исходя из конкретной политической или иной ситуации внутри страны. Однако этот факт мог быть использован для ослабления Содружества, для противопоставления входящих в него государств. Предвидя это, главы государств проявили решимость сохранить единство, продемонстрировали подлинное искусство компромисса — выработали удовлетворяющую всех форму политического заявления в связи с принятием Устава СНГ.

Готовность членов Совета глав государств пожертвовать несомненными политическими дивидендами во имя сохранения единства СНГ еще раз была продемонстрирована ими при подписании Договора об Экономическом союзе.

— Иван Михайлович! Как Вы планируете отметить годовщину образования Содружества?

— Пышных народных гуляний по этому поводу устраивать никто не собирается. Между тем встреча с руководством республики, главами дипломатических миссий, аккредитованных в Беларуси, намечается. Будет предоставлена возможность обменяться мнениями о существующих проблемах и путях укрепления Содружества.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Погляд народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь

Распродаж Беларусі пачаўся. Што будзе далей?

Віктар АЛАМПІЕЎ,
Леанід БАРШЧЭЎСКІ,
Юрый БЕЛЕНЬКІ,
Зянон ПАЗЬНЯК

Так, пачаўся. Пачалося тое, што павінна было здарыцца пасля таго, як у жніўні і снежні 1991 года на Беларусі ацалелі старая наменклатурная ўлада і адміністрацыйная сістэма. Эканамічная дэградацыя, крызіс і страта суверэнітэту ў такіх варунках — наканаваныя з'явы. Аналагічныя працэсы мы назіралі ва ўсіх посткамуністычных краінах, дзе засталіся ва ўладзе старыя структуры. Аднак "беларускі шлях" асаблівы і цалкам выключны. Аналагаў няма. Камуністычная наменклатура краін былога савецкага лагера пасля дасягнення дзяржаўнага суверэнітэту паўсюдна стала на абарону нацыянальнай дзяржаўнасці і незалежнага развіцця. У гэтым яна ўбачыла магчымасць захавання сваёй улады і кансервацыі старых структур. Беларуская ж наменклатура (практычна цалкам "манкуртызаваная") стала не на нацыянальны, а, не пабаймся сказаць, на крымінальны шлях, на дарогу крымінальшчыны — раскрадання дзяржаўнай маёмасці, гандлю нацыянальнымі інтарэсамі. І як вынік — прыйшла да ліквідацыі дзяржаўнай незалежнасці.

Раней мы і іншыя прадстаўнікі БНФ, а таксама дэпутаты, якія прытрымліваюцца дэмакратычных поглядаў, неаднаразова пісалі і папярэджвалі аб прычынах крызісу і спосабах, якімі будуць разбураць дзяржаву Беларусь. Далёка не апошнюю ролю ў гэтым разбурэнні адыгрываюць расійскія спецслужбы (якія вольна дзейнічаюць на Беларусі) і імперска-камуністычная "пятая калона". Аднак галоўную небяспеку ўяўляе і непасрэдна разбуральную працу праводзіць мясцовая наменклатура — Савет Міністраў і дэпутацкая большасць Вярхоўнага Савета. Ужыта небяспечная форма ліквідацыі незалежнасці — адмаўленне ад уводу нацыянальнай валюты і ад нацыянальнай фінансава-крэдытнай палітыкі, прапануецца ўваходжанне ў расійскую грашовую сістэму, у сістэму краіны, якая ідзе да таго ж па шляху жорсткага ліберальнага капіталізму.

Калі гэта адбудзецца (а дэпутацкая большасць Вярхоўнага Савета нядаўна ратыфікавала такое пагадненне), то катастрофа Беларусі стане развівацца паскорана і незваротна.

Што ж пачнецца?

Фінансава-крэдытная сістэма. Беларускія банкі перастануць існаваць. Як параўнальна слабыя і больш нізкага ўзроўню, яны будуць паглынуты велізарнымі расійскімі. (У лепшым выпадку стануць філіяламі, але гэта малаверагодна.)

Беларускім прадпрыемствам створаць умовы, пры якіх яны стануць банкрутамі і пяройдуць ва ўласнасць прадпрымальнікаў і бізнесменаў Расіі. (Аб беспрацоўі пры гэтым мы ўжо не кажам.) На тэрыторыі Расіі ўтворана вэксальная форма разлікаў, пры якой пазыкі (даўгі) прадпрыемстваў афармляюцца вэксалямі. Гэта такая сістэма, калі пры адсутнасці грошай і магчымасці выплат па пазыках даўжнік разлічваецца сваёй маёмасцю. Пры канцэнтрацыі 30 працэнтаў вэксаляў у адных руках прадпрыемства пераходзіць да вэксалетрымальніка. Ва ўмовах штучна створанай паліўна-энергетычнай залежнасці і пераважнай залежнасці ад паставак з Расіі сітуацыю банкруцтва для беларускіх прадпрыемстваў стварыць няцяжка. Яна ўзнікае сама па сабе. (Метадаў мы апісваць не будзем — іх шмат. Калі, скажам, беларускае прадпрыемства пастаўляе тавар у Расію і мае сто пастаўшчыкоў камплектуючых у Расіі, то дастаткова арганізаваць у "патрэбны" момант непастаўкі ад аднаго з іх, каб атрымаць "вынікі" па вэксалях на карысць расійскага заказчыка і г.д. Прыёмы вядомыя.) Вядома ж, будзе разбурана і наша прадпрымальніцтва. Грашовыя дачыненні — кроў эканомікі. Але ў расійскай сістэме дачыненняў наша прадпрымальніцтва загіне, будзе праглынута расійскім.

Наіўныя людзі, паслухаўшы авантурныя прамовы кіраўнікоў Саўміна, думаюць, што хутка з'явяцца расійскія рублі (Расія "дасць") ці што "з'явяцца" яны пры быццам бы выгадным абмене беларускіх разліковых білетаў і рублёў у прапорцыі 1:1. Рэальная ж сацыяльна-эканамічная сутнасць такога абмену акажацца нечаканай для многіх, хто прывык жыць ілюзіямі простых лікаў, не ведаючы, што за імі стаіць. А рэальна будзе тое, што ў некалькі разоў зменшыцца зарплата жыхароў Беларусі, а цэны стануць як у Расіі. Гэта, вядома, павінна разглядацца тэарэтычна як часовая з'ява. Але гэта будзе ўдар па нас і па нашых прадпрыемствах такой магутнай сілы, якога мы не вытрымаем.

Энергарэсурсы. Наіўным людзям кажуць, што пры "аб'яднанні" грашовых сістэм Беларусі і Расіі з'явяцца танныя энергарэсурсы. У сапраўднасці танных рэсурсаў не будзе. Афіцыйныя прадстаўнікі Расіі заявілі аб пераходзе ў бліжэйшы час на сусветныя цэны на нафту. Але ўжо сёння Беларусь фактычна купляе нафту ў Расіі па сусветнай цане. Сусветная цана складаецца для нас з цаны на нафту, па якой яна прадаецца спажыўцам Расіі, пры пераразліку па курсу долара да рубля (дарэчы, завышанаму, як сцвярджаюць самі расійцы, у некалькі разоў) плюс мытная пошліна — каля сарака долараў ЗША за тону. Рэальна ж, калі ўлічыць грабежніцкія для нас узаемаразлікі з Расіяй, што робяцца пад дыктатам нафтавага шантажу, мы даўно ўжо купляем гэтую нафту па цане ў 2—2,5 раза вышэй за сусветную. Гэткім метадам выдаілі Украіну, цяпер выдойваюць Беларусь.

Зразумела, што калі адменіцца мытная пошліна, а фактычная цана расійскай нафты стане сусветнай, то рэальны грабежніцкі яе кошт для нас не зменіцца. Ён заўсёды будзе вышэйшы, чым у Расіі, улічваючы манапалізм Расіі ў пастаўках нафты і складваючуюся структуру гандлю паміж дзвюма краінамі. Больш таго, адмена мытных пошлін прадугледжвае плацяжы ў федэральны расійскі бюджэт, бо ўнутраныя цэны ў Расіі на шэраг тавараў фарміруюцца з улікам бюджэтных датацый. Адпаведна ўзровень жыцця на Беларусі стане ніжэйшы за расійскі.

Расія застаецца і будзе заставацца імперыялістычнай дзяржавай з глабальнымі інтарэсамі за сваімі межамі. Яна павінна траціцца на вялікае войска, узбраенне, утрыманне спецслужб, замежных структур і г.д. Усё гэта ляжа на плечы падаткаплацельшчыка і ў Беларусі, калі наша краіна будзе запрададзена і паглынута Расіяй. Народ вымушаны будзе аплачваць чужую палітыку, чужое войска, чужыя непатрэбныя яму геапалітычныя інтарэсы і авантуры. (У тым ліку і жыццямі.)

Новая сітуацыя прывядзе да адкрыцця ўсіх памежных шлюзаў з Расіяй і ўстанаўлення досыць жорсткіх межаў з іншымі краінамі: у дадатак да Польшчы з Украінай, Літвой, Латвіяй. Расія запатрабуе гэтага за наш кошт. Расійскі капітал апынецца тады ў нас па-за канкурэнцыяй (з-за слабасці нашых рынкавых суб'ектаў). Па-за канкурэнцыяй у канчатковым выпадку апынуцца ў нас і расійскія тавары, што выкліча спыненне нацыянальнай вытворчасці.

Сельская гаспадарка. Калгасам давядзецца, згодна з расійскімі законамі, плаціць у расійскі бюджэт 10-працэнтны падатак на дабаўленую вартасць, які ў нас, дарэчы, для іх ужо даўно зняты. Гэта зменшыць канкурэнтнасць нашых прадуктаў, выкліча рост цэн на іх. Да таго ж беларускія сельгаспрадпрыемствы не атрымаюць "цэнтралізаваных" крэдытаў у неабходных памерах. І тут таксама пачнецца крах і скупка збанкрутаваных прадпрыемстваў расійскім капіталам, якому ўжо стала цесна ў сваіх межах.

Прыватызацыя. Народныя дэпутаты дэмакратычнай арыентацыі прапаноўвалі прыняць закон аб імянных прыватызацыйных чэках, па якіх кожны грамадзянін Беларусі павінен быў бы атрымаць частку дзяржмаёмасці ў выглядзе трох квот: жыллёвай, зямельнай і часткі дзяржмаёмасці прадпрыемстваў. Пры глыбокіх спадах эканомікі, калі вельмі складана забяспечыць сацыяльную абарону людзей, дзяржава павінна была падзяліцца часткай сваёй уласнасці, каб даць сваім грамадзянам шанц выжыць. Аднак большасць Вярхоўнага Савета не прыняла гэтых заканадаўчых прапаноў. Усе грамадзяне зямлю не атрымалі. Прыватызацыйныя чэкі не выдадзены. Цяпер жа ўрад гатовы прыняць умовы ўказаў расійскага прэзідэнта (продаж зямлі і г.д.), паводле якіх наша зямля, наша ўласнасць трапіць у рукі не нашых грамадзян, а многіх багатых расіян. Гэта ўсё вынікае з так званага "аб'яднання" грашовых сістэм Расіі і Беларусі.

Сацыяльнае забеспячэнне. Уваходжанне ў грашовую сістэму Расіі (і страта ў сувязі з гэтым дзяржаўнай незалежнасці) выкліча скарачэнне нашых фондаў сацыяльнай абароны насельніцтва. У нас фонд сацыяльнай абароны фарміруецца з памеру 40,8 працэнта ад фонду заработнай платы, а ў Расіі толькі 36 працэнтаў. У нас пенсіённы фонд утвараецца з памеру 89 працэнтаў ад фонду сацыяльнай абароны, а ў Расіі ўсяго 72 працэнтаў. У Беларусі давядзецца замарозіць пенсіённы фонд і істотна пагоршыць сацыяльную абарону людзей.

Да 1 снежня 1993 года паводле пастановы Вярхоўнага Савета ад 23 лістапада ўрад павінен быў распрацаваць і прадставіць Вярхоўнаму Савету механізм функцыяніравання беларускага разліковага білета як адзінага плацежнага сродку. Аднак распрацоўка ў вызначаны тэрмін прадстаўлена не была. Замест гэтага спадар Кебіч і яго паручэнцы накіраваліся ў Расію да прэм'ера Чарнамырдзіна з тым, каб, вобразна кажучы, стаць на калені і таргавацца аб здачы Беларусі. Гандаль скончыўся працягваннем энергетычнай агоніі да Новага года (1994-га) узамен за здачу Расіі Мазырскага і Полацкага нафтаперапрацоўчых заводаў, дзе, як паведаміў сп. Кебіч, "и мы будем иметь акции".

Уся гэта, з дазволу сказаць, "палітыка" (у якой мы бачым прыкметы дзяржаўнага злачынства) нагадвае псіхалогію і матывацыю п'яніцы, які выносіць з дому рэчы і закладвае іх, каб апахмяліцца. Зразумела, чым канчаецца такая "гаспадарчая дзейнасць" п'яніцы.

Акрамя таго, у Расіі сп. Кебіч дамовіўся, што да 1 студзеня 1994 года будзе зроблена палітычная заява. Якога характару? На мове палітыканаў яна, вядома, будзе такой — "О вхождении Республики Беларусь и России в единую денежную систему". А на самай справе размова будзе ісці аб адмове Беларусі ад незалежнасці. Пры гэтым спадар Кебіч заўважыў, што "Борис Николаевич тоже одобрил и тоже назвал пока (!) только Беларусь, чтобы **на примере Беларуси опробовать** всю эту систему". Цынізму ў выказваннях "цяперашніх" і "ўчарашніх" ужо даўно няма межаў. Таму не будзем іх абмяркоўваць. Яны кажуць самі за сябе. Чарговы эксперымент над беларусамі пачаўся. Пра магчымыя вынікі яго прадстаўнікамі БНФ ужо напісана і сказана не аднойчы: разам са стратай дзяржаўнай незалежнасці беларусы паступова страцяць сваю маёмасць і права на нацыянальную ўласнасць. Замест незалежнай дзяржавы атрымаюць бантустан. Яны стануць народам, што жыве на сваёй гістарычнай зямлі, якая ім ужо не належыць, не з'яўляецца іх уласнасцю; яны будуць працаваць на прадпрыемствах, уласнікамі якіх ні ў прыватным, ні ў грамадскім, ні ў дзяржаўным сэнсе яны не з'яўляюцца, будуць выпрацоўваць тавары, прыбыткам ад якіх не змогуць карыстацца. Такі стан нацыянальнай супольнасці заўсёды сацыяльна бядотны. Ён поўнасцю бесперспектыўны і азначае яе культурную і гістарычную смерць.

Пра рэальныя шляхі выхаду са становішча, пра канкрэтныя эканамічныя і палітычныя крокі, якія неабходны, каб прадухіліць сацыяльна-эканамічную і палітычную катастрофу, апазіцыя і прадстаўнікі БНФ, дэпутаты, якія з'яўляюцца прыхільнікамі дэмакратычных працэсаў, неаднаразова, часта і настойліва пісалі, казалі і пераконвалі. Тут няма пытанняў. Тое, што трэба рабіць, зразумела ўжо кожнаму нармальнаму беларусу. Таму не будзем паўтараць сказанае.

Першы эксперымент па разрабаванню і разбурэнню нашай эканомікі, фінансаў і стварэнню штучнай паліўна-энергетычнай залежнасці Беларусі ад Расіі прайшоў удала. Удала падабрана і выніковая "ідэалогія" эксперыменту (для "саўка"): "зачэм нам этат суверэніцет!" Цяпер разгортваецца другі эксперымент па палітычнай рэалізацыі першага.

Наша задача ў гэтых заметках — звярнуць увагу на тое, што чакае ўсіх, калі эксперымент над намі працягнецца. Хочам толькі заўважыць, што хоць і цяжкія выпрабаванні чакаюць Беларусь і яе народ, але ў рэшце рэшт нічога не атрымаецца ў яе непрыяцеляў як унутраных, так і знешніх. Жыве Беларусь і будзе жыць! Ніякія рашэнні гэтага тройчы нелегітымнага Вярхоўнага Савета, накіраваныя на згубу нашай нацыі і дзяржавы, не маюць прававой і законнай сілы. Яны будуць адменены і прызнаны несапраўднымі першым жа дэмакратычным, нармальным парламентам. Раскрадзеныя, раздадзеныя урадам і закладзеныя прадпрыемствы будуць нацыяналізаваны, вернуты беларускай дзяржаве і ўласнікам. Будзе наведзены парадак. Народная маёмасць знойдзе нарэшце сваіх гаспадароў, справядлівасць вернецца разам з законамі, разам з уласнасцю, свабодай і сапраўднай незалежнасцю нашай краіны.

АД РЭДАКЦЫІ

Можна прадугадаць, які рэзананс выкліча артыкул групы народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь. Паляцяць стрэлы не толькі ў адрас аўтараў, але і рэдакцыі. Хоць мы лічылі і лічым, што лепш, калі людзі спрачаюцца, высвятляюць пазіцыі на старонках газет, чым у акопах, якія знаходзяцца адзін супраць другога. Ды і ў 18-м артыкуле Закона аб статусе народнага дэпутата сказана: "Рэдагаванне выступленняў народнага дэпутата.., а таксама матэрыялаў, прадстаўленых ім для апублікавання, без згоды народнага дэпутата... не дапускаецца". У дадзеным выпадку народныя дэпутаты Рэспублікі Беларусь В.Алампіеў, Л.Баршчэўскі, Ю.Беленькі, З.Пазьняк папрасілі надрукаваць матэрыял без скарачэнняў і правак.

Вядома ж, у іх апанентаў могуць быць свае меркаванні. "Народная газета" з павагай аднясецца да самых розных поглядаў.

Пасля падзеі

Ці стануць нашы ліберылы трэцяй сілай?

У Гомелі прайшоў IV з'езд Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі

Анатоль ГАТОУЧЫЦ

Нашых айчынных ліберылаў (не блытаць з "маскоўскімі сакалянятамі") ведаюць пакуль што не вельмі многія. Ва ўсякім разе, не настолькі, як дзве палярныя палітычныя сілы — камуністаў і БНФ. Гэта, як паказаў з'езд, непакоіць ліберылаў Аб'яднанай дэмакратычнай партыі. Іх мэта — узняцца да ўзроўню трэцяй палітычнай сілы, калі не ў адзіночку, дык разам з блокам "Вясна-94". Для чаго — зразумела: каб весці дэмакратычныя пераўтварэнні, ствараць прававую дзяржаву на аснове рынкавых адносін, дзе свабода асобы і яе ўласнасць вышэй за ўсё.

Падставы для запаўнення палітычнага вакууму ў цэнтры, мяркуюць ліберылы, у іх ужо ёсць: АДПБ пазнаюць у грамадстве, партыя мае абласныя арганізацыі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Магілёве, Брэсце, суполкі ў Гродне і іншых гарадах. Яна адклікаецца на ўсе важнейшыя палітычныя і эканамічныя падзеі, выступае ініцыятарам розных канферэнцый, заявіла пра сябе ў апошні час у Вярхоўным Савеце рэспублікі як удзельніца заканатворчай работы. Аднак ліберылы не заспакойваюцца, добра ўсведамляючы, што ўсяго гэтага мала.

У справаздачы старшыні рады АДПБ Аляксандра Дабравольскага выразна акрэсліваліся тры бягучыя задачы. Па-першае, трэба належным чынам паставіць інфармацыйную дзейнасць. І ў адносінах да грамадства, і да сваіх членаў і суполак. Па-другое, зразумела, узмацняць работу ў цэнтры і асабліва на месцах. У трэцюю праблему вырастае фінансаванне партыі: сяброўскіх складчын для шырокага размаху, канешне, не хапае.

Думаючы аб уплывовасці сваёй партыі, дэлегаты (а было іх больш за пяцьдзесят з усіх абласцей рэспублікі) прапаноўвалі розныя шляхі. І, бадай, толькі на сітуацыю ў рэспубліцы ўсе дэлегаты глядзелі аднолькава: паглыбленне сацыяльна-эканамічнага крызісу ёсць вынік палітыкі кіраўніцтва рэспублікі. У прынятай рэзалюцыі засведчана нават, што Саўмін на чале з В.Кебічам — гэта "ўрад нацыянальнай катастрофы".

Таму ліберылы збіраюцца сумесна з іншымі дэмакратычнымі рухамі дамагацца адстаўкі ўрада, прызначэння будучай вясной новых выбараў. Без гэтага не пойдуць рэформы, не будзе законнай прыватызацыі, а значыць, і галоўнага стабілізатара ў грамадстве — сярэдняга слоя прадпрымальнікаў.

Дыпламатыя ў асобах

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Бразіліі Себасціао До Рэга Барас Нета ўручыў вярыцельныя граматы Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіславу Шушкевічу.

Пасля абмену прамовамі па такой знамянальнай для абедзвюх краін падзеі паміж паслом і кіраўніком парламента адбылася гутарка, у якой прыняў удзел міністр замежных спраў Беларусі Пётр Краўчанка.

❑

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Бразіліі Себасціао До Рэга Барас Нета нарадзіўся ў 1940 годзе ў Рыо-дэ-Жанейра. Адукацыю атрымаў на радзіме і ў ЗША. Займаў розныя пасады у дзяржаўных установах Бразіліі і прадстаўніцтвах краіны за мяжой. З 1984 па 1987 год узначальваў дэпартамент эканомікі, затым быў намеснікам сакратара па эканамічных і гандлёвых справах. У 1989 годзе назначаны паслом Бразіліі ў Расіі.

Белінфарм.

Навіны двума абзацамі

Падатак, які не ў цяжкасць

Бабруйскі гарадскі Савет народных дэпутатаў прыняў рашэнне ўвесці мясцовы падатак на ўтрыманне дзіцячых дашкольных устаноў і знайшоў поўнае разуменне ў працоўных калектывах.

Таму ў Бабруйску і працягваюць працаваць усе бюджэтныя дзіцячыя садкі і яслі.

Захад прываблівае мільёны

Не змяншаецца колькасць жадаючых трапіць на той бок Буга.

Як паведамілі работнікі мытнай службы, толькі праз аўтамабільныя пагранічныя пункты ў Брэсце з пачатку года праехала каля двух мільёнаў чалавек.

У гонар славутага земляка

Міжнародны дзіцячы музычны фестываль імя Міхала Агінскага адбыўся ў Смаргоні.

Лаўрэатамі сталі піяністка Дзінара Мазітава з Ліды, мінскі скрыпач Арцём Шышкоў і віяланчэлістка Эмануэла Панятоўская з Варшавы.

"Асновы матэматыкі" ў музычным каледжы

Музычны каледж створаны на базе Брэсцкага музвучылішча.

На думку яго дырэктара Жанны Савінай, гэта пераўтварэнне дасць магчымасць увесці новыя курсы, напрыклад "Асновы матэматыкі і інфарматыкі", "Музыка ў школе" і іншыя, якія дапамогуць вучням набыць веды за курс сярэдняй школы і больш паглыблена пазнаёміцца з будучай спецыяльнасцю.

Канверсійны тамограф

Першы ў Беларусі магнітна-рэзанансны тамограф пачаў працаваць у рэнтгенадыягнастычным аддзяленні Магілёўскай абласной бальніцы.

Пры дапамозе гэтай навейшай устаноўкі можна абследаваць любыя ўнутраныя органы чалавека, у тым ліку і спінны мозг. Прадыягнаставаны першыя сотні хворых, якім не дапамаглі традыцыйныя метады. "Усебачны" тамограф зроблены на адным з канверсійных маскоўскіх заводаў.

Добрыя весткі

Яшчэ адно "акно" ў Еўропу

Новы пагранічны пераход "Пясчатка—Полаўцы" пачаў дзейнічаць у Камянецкім раёне. Ён адкрыты ў выніку дагаворанасцей паміж урадамі Беларусі і Польшчы.

Мытны пост у Пясчатцы аснашчаны ўсім неабходным абсталяваннем і будзе працаваць у кругласутачным рэжыме, што дасць магчымасць значна разгрузіць усім вядомы АКПП "Варшаўскі мост".

Прадугледжваецца, што Пясчатка будзе абслугоўваць аўтамабілі з грамадзянамі, якія едуць па службовых справах, а таксама аўтобусы з дзецьмі, што накіроўваюцца ў заходнія краіны на аздараўленне.

У недалёкай перспектыве намячаецца адкрыццё яшчэ аднаго пераходу ў раёне вёскі Дамачава, што за сорак кіламетраў ад Брэста, — для абслугоўвання выключна жыхароў Беларусі.

Іван КУКСА, Белінфарм.

Официально

Тысяча рублей одной купюрой

Национальный банк Республики Беларусь выпускает в обращение расчетный билет Национального банка Республики Беларусь достоинством 1000 рублей, равный 10000 рублей в рублевом эквиваленте.

Билет изготовлен размером 105х35 мм, выполнен на качественной, жесткой на ощупь белой бумаге, имеющей характерный хруст, со специальными волокнами, а также общим водяным знаком в виде ломаных линий и впресованной вертикальной защитной нитью, видимой на просвет.

Преобладающие цвета лицевой и оборотной сторон билета темно-синий, зеленый, розовый.

Основное изображение лицевой стороны — вид здания Президиума Академии наук Республики Беларусь; на оборотной — герб Республики Беларусь "Пагоня" в орнаментальном оформлении с указанием достоинства билета и годом выпуска.

Семизначный номер с двухбуквенной серией черного цвета расположен в центре левой части билета, аналогичный номер красного цвета — внизу справа на орнаментальной полосе.

В структуру расчетного билета достоинством 1000 рублей введены элементы защиты их от подделки.

Выпускаемый в обращение расчетный билет обязателен к приему его в рублевом эквиваленте всеми государственными, кооперативными, общественными и другими предприятиями, учреждениями, организациями, колхозами и отдельными лицами для оплаты всех товаров и услуг, а также учреждениями банков и предприятиями Министерства связи для зачисления на счета, во вклады, на аккредитивы и для перевода без всяких ограничений на территории Республики Беларусь.

Национальный банк Республики Беларусь.

Криминал и политика

О "деле Сайкова" и милиции в зале облсовета

Андрей НИКОЛЬСКИЙ

С подачи Могилевской областной прокуратуры об исчезновении 28 миллионов партийных денег знает всякий, кто хоть мало-мальски следит за криминальной хроникой.

У меня нет намерения раскрывать секреты следствия, пытаться оценивать, кто прав, а кто виноват в пропаже. Заинтересовало другое: уникальность событий вокруг следствия. Согласитесь, далеко не каждое уголовное дело сопровождается несколькими (!) сессиями облсовета, специальным заседанием парламентской комиссии, жесткими, на грани фола, запросами народного депутата Республики Беларусь Василия Леонова в адрес Генерального прокурора. Есть все основания полагать, что когда-нибудь рассказ об этом послужит учебным материалом для будущих криминалистов. А пока попытаемся взглянуть журналистским глазом на широко известное так называемое дело Сайкова с учетом последних обстоятельств.

❑

Такого мне не приходилось видеть за всю свою многолетнюю газетную практику: у каждой двери зала, где проходила сессия Могилевского облсовета, стояли три-четыре милиционера. А неподалеку от здания бывшего обкома партии прохлаждалась в ожидании команды группа омоновцев.

Никто из могилевчан не собирался атаковать своих депутатов, и необходимости в защите не было. Судя по всему, правоохранительные инстанции собирались предпринять еще одну попытку арестовать на выходе из зала депутата облсовета Александра Сайкова.

Не желая обидеть никого, скажу, что даже приезд на сессию первого заместителя премьер-министра Михаила Мясниковича и министра сельского хозяйства Федора Мирочицкого не вызвал такого интереса, как предстоящая прокурорская операция.

Зависимость прокуроров от решений сессий по чисто криминальным ситуациям давно наводит на грустные размышления. Виновен или невиновен имярек? Запереть его в камеру или оставить на свободе? Решать такие специфические (и в то же время больно бьющие по судьбе живого человека!) вопросы в атмосфере многолюдного собрания, на мой взгляд, противоестественно.

